*У. П. Саўко, І. Э. Саўко*

# НАВУЧАННЕ СТАРШАКЛАСНІКАЎ ЛЕКСІЧНЫМ НОРМАМ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

У адпаведнасці з вучэбнай праграмай па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, лексічныя нормы вывучаюцца ў 10 класе ў раздзеле “Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення”. У выніку старшакласнікі павінны не толькі ўзнавіць і паглыбіць раней атрыманыя веды па лексікалогіі, удасканаліць адпаведныя ўменні і навыкі, але і ведаць лексічныя нормы, захоўваць іх у вусным і пісьмовым маўленні, знаходзіць і выпраўляць маўленчыя памылкі, устанаўліваць іх прычыны.

Часцей за ўсё да парушэння лексічных нормаў прыводзіць ужыванне слова з неўласцівым яму значэннем, напрыклад: *У студні 1919 г. адбылося ўтварэнне БССР* (С.) [1]. І калі ў рускай мове такія памылкі, як правіла, з’яўляюцца пры выкарыстанні запазычаных слоў, то ў беларускай, на жаль, гэта датычыцца і іншай лексікі.

Для правільнага ўжывання слоў у маўленні неабходна ўлічваць і іх спалучальныя магчымасці, якія звычайна абумоўлены моўнай традыцыяй. Парушэнне лексічнай спалучальнасці таксама прыводзіць да маўленчых памылак: *Пажылы зубр павольна падышоў да агароджы вальеры* (С).

У беларускім маўленні дастаткова часта сустракаюцца русізмы, што, як вядома, не адпавядае нормам літаратурнай мовы: *Васіль Дзяцел з трудом успрымае новае* (С.). Негатыўным уплывам рускай мовы тлумачацца і памылкі, падобныя на наступную: *Сёння мы пачуем гульню на розных музычных інструментах* (Т.). Як вядома, у рускай мове слова “игра” выкарыстоўваецца, калі гаворка ідзе і пра выкананне музычных твораў, і пра заняткі, якія служаць для забавы, адпачынку і інш. У беларускай мове ў гэтых выпадках ужываюцца розныя словы: “*ігра*” і “*гульня*”.

Вельмі шмат памылак, абумоўленых і неадрозненнем паронімаў: *Зямля тут была гліняная* (неабходна: *гліністая*), *часта сустракалася каменне* (Д.). Асноўнай прычынай такіх маўленчых недахопаў з’яўляецца падобнае гучанне слоў, якія, аднак, маюць розны сэнс.

Выкарыстанне лішняга слова (плеаназм) таксама не з’яўляецца нормай літаратурнай мовы, напрыклад: *Адкрываюцца новыя школы і спартыўныя стадыёны* (Р.). Да маўленчых памылак прыводзіць і неапраўданае ўжыванне ў невялікім кантэксце адных і тых жа ці аднакаранёвых слоў: *Упрыгожыць зялёную прыгажуню можна разнастайнымі цацкамі* (Р.)

Ёсць і іншыя памылкі, абумоўленыя парушэннем лексічных нормаў, але, паколькі час на вывучэнне лексікалогіі на базавым узроўні ў 10 класе абмежаваны, дастаткова будзе арганізаваць працу па папярэджванні і выпраўленні пераважна вышэйназваных маўленчых недахопаў. Пры

[1] Пры ўказанні на тое, адкуль узяты прыклады з памылкамі, выкарыстоўваюцца наступныя скарачэнні: С. – сачыненне вучня, Р. – радыёперадача, Т. – тэлеперадача, Д. – друкаванае выданне.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вывучэнні раздзела на павышаным узроўні праца над лексічнымі нормамі можа ажыццяўляцца больш грунтоўна.

Работу над лексічнымі нормамі мэтазгодна праводзіць на працягу вывучэння ўсіх тэм раздзела. Агульнае ўяўленне пра тое, што такое лексічныя нормы, можна даць ужо на першых занятках. Дзесяцікласнікі павінны ўсвядоміць, што захаванне лексічных нормаў дасягаецца ў выніку разумення лексічнага значэння слова і ўжывання яго з улікам гэтага значэння, ведання лексічнай спалучальнасці слоў, уліку мнагазначнасці або аманіміі слоў, уліку падзелу лексікі на агульнаўжывальную і абмежаванага ўжытку і інш. Парушэнне лексічных нормаў вядзе да маўленчых памылак.

Першая тэма, якая вывучаецца ў раздзеле “Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення”, – “Лексічнае значэнне слова”. Пасля актуалізацыі неабходных ведаў і выканання практыкаванняў, звязаных з тлумачэннем лексічнага значэння слоў, у тым ліку з дапамогай тлумачальнага слоўніка, увагу вучняў мэтазгодна звярнуць на такія маўленчыя памылкі: ужыванне слова з неўласцівым яму значэннем, парушэнне лексічнай спалучальнасці слоў, ужыванне русізмаў, выкарыстанне лішняга слова (плеаназм), недарэчнае выкарыстанне адных і тых жа або аднакаранёвых слоў. Гэта можна зрабіць з дапамогай наступнай табліцы:

| Від памылкі | Прыклад | Каментарый |
|---|---|---|
| Ужыванне слова з неўласцівым яму значэннем | *Змагароў за свабоду нашай краіны зараз успамінаем мы і праз гады будуць успамінаць нашы продкі.* | Правільна: не “*продкі*”, а “*нашчадкі*” |
| Парушэнне лексічнай спалучальнасці слоў | *Сёння адбылося ўручэнне ганаровых званняў.* | Ганаровыя званні прысвой-ваюць, а не ўручаюць. |
| Выкарыстанне лішняга слова | *Усе дзеці атрымалі памятныя сувеніры.* | Сувенір – гэта падарунак на памяць. |
| Ужыванне русізмаў | *Давайце звернемся да арфаграфічнага славара.* | Правільна: *да арфаграфічнага слоўніка.* |
| Недарэчнае выкарыстанне адных і тых жа або аднакаранёвых слоў | *Новы год – гэта свята, якое святкуюць усе.* | Недарэчнае выкарыстанне блізка адзін ад аднаго аднакаранёвых слоў “*свята*” і “*святкуюць*” |

Фарміраванню ўменняў знаходзіць і выпраўляць маўленчыя памылкі, устанаўліваць прычыны парушэння лексічных нормаў будуць садзейнічаць практыкаванні з наступнымі заданнямі:

1. Дакажыце, што ў сказах парушаны лексічныя нормы, устанавіце прычыны гэтых парушэнняў, адрэдагуйце сказы.

2. Адзначце сказы, у якіх ёсць маўленчыя памылкі. Абгрунтуйце сваё меркаванне.

3. Адзначце сказ, у якім лексічныя нормы не парушаны.

Наступныя тэмы, якія разглядаюцца на ўроку, – “Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнні слова. Амонімы”. У класах філалагічнага профілю можна паведаміць вучням і пра такую

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

памылку, як недарэчнае ўжыванне мнагазначных слоў ці амонімаў, якое прыводзіць да двухсэнсоўнасці выказвання, напрыклад: *Мы праслухалі прагноз надвор'я на заўтра*. Аднак варта падкрэсліць, што ў пэўным кантэксце падобныя сказы не будуць двухсэнсоўнымі: *Мы праслухалі прагноз надвор'я на заўтра. Зноў будзе вельмі холадна*.

Фарміраванню ўменняў заўважаць такую памылку будзе садзейнічаць выкананне практыкаванняў, у якіх патрабуецца прачытаць сказы і вызначыць, у якіх з іх выкарыстанне мнагазначных слоў ці амонімаў можа прывесці да недакладнасці ва ўспрыманні выказвання.

Пасля актуалізацыі ведаў пра сінонімы мэтазгодна паведаміць вучням, што трэба быць вельмі ўважлівымі пры выкарыстанні гэтых лексічных адзінак. Блізкасць лексічнага значэння сінонімаў стварае ўмовы для іх узаемазамены, але яна не заўсёды магчымая, таму што залежыць ад лексічнай спалучальнасці слоў. Напрыклад, можна сказаць "*будзе сустрэча з пісьменнікам*" і "*адбудзецца сустрэча з пісьменнікам*", але нельга сказаць "*Сёння адбудзецца цудоўнае цёплае надвор'е без ападкаў*" (Р.).

Тэма "Паронімы" вельмі важная з пункту гледжання фарміравання культуры маўлення, таму што памылкі, абумоўленыя неадрозненнем лексічнага значэння слоў з гукавым і структурным падабенствам, сустракаюцца дастаткова часта, напрыклад: *Неабходна адзначыць немагчымасць выканання гэтай работы ва ўсталяваныя тэрміны* (Р.). Таму тут будуць дарэчы практыкаванні на ўстанаўленне адпаведнасці паміж словамі-паронімамі і іх значэннем, на знаходжанне і выпраўленне памылак, выкліканых неадрозненнем паронімаў.

Маўленчыя памылкі таксама ўзнікаюць пры недакладным ужыванні займеннікаў, пры выкарыстанні слова або словазлучэння іншай стылёвай афарбоўкі, пры неразмежаванні лексікі розных гістарычных эпох, пры неабгрунтаваным пропуску слова, у выніку чаго скажаецца змест выказвання, пры неабгрунтаваным ужыванні прастамоўных, дыялектных ці жаргонных слоў і выразаў. Пра такія парушэнні лексічных нормаў старшакласнікі таксама павінны ведаць, таму што пры праверцы і ацэнцы іх творчых прац гэтыя памылкі ўлічваюцца. Для фарміравання ўменняў знаходзіць і выпраўляць такія памылкі можна прапанаваць заданне на рэдагаванне сказаў.

Пасля паэтапнага разгляду асноўных прычын парушэнняў лексічных нормаў пажадана скласці абагульняльную табліцу, у якой адлюстраваць увесь раней разгледжаны тэарэтычны матэрыял, затым прапанаваць практыкаванні на знаходжанне і выпраўленне розных маўленчых памылак.

Такім чынам, пры сістэматызацыі і пашырэнні ведаў па лексікалогіі ў 10 класе вялікую ўвагу пажадана надаць фарміраванню культуры маўлення вучняў. Гэтаму будзе садзейнічаць азнаямленне старшакласнікаў з прычынамі парушэння лексічных нормаў і выкананне школьнікамі практыкаванняў на знаходжанне, выпраўленне і класіфікацыю памылак. Такая праца дапаможа дзесяцікласнікам не толькі заўважаць гэтыя памылкі ў чужым маўленні, але і не дапускаць іх у сваіх выказваннях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Навучанне старшакласнікаў лексічным нормам сучаснай беларускай мовы / У. П. Саўко, І. Э. Саўко // Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі “Усходнеславянскія мовы ў сучаснай лексікаграфіі”. Мінск, 11 снежня 2015 г. – Мінск: БДПУ, 2015. – С. 291–294.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ